ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 4 (634) | Субота, 25 студзеня 1986 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## У ДОБРЫ ШЛЯХ, МЕСЯЧНІК!

23 лютага ўся наша краіна, яе Узброеныя Сілы ўрачыста адзначаюць 68-ю гадавіну Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Надаючы вялікае значэнне выхаванню працоўных і моладзі на гераічных традыцыях Савецкіх Узброеных Сіл і ў мэтах далейшай актывізацыі ваенна-патрыятычнай і абаронна-масавай работы ў перыяд з 23 студзеня па 23 лютага бягучага года па ўсёй нашай краіне праводзіцца традыцыйны ўсесаюзны месячнік абаронна-масавай работы. Сёлета ён прысвячаецца 68-й гадавіне Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту і будзе праходзіць пад знакам мабілізацыі працоўных, моладзі на дастойную сустрэчу XXVII з'езда КПСС.

Усесаюзны месячнік — гэта комплекс ваенна-патрыятычных і абаронна-масавых мерапрыемстваў, якія па традыцыі напярэдадні Дня Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту праводзяць пад кіраўніцтвам партыйных органаў арганізацыі прафсаюзаў, Ленінскага камсамола і абароннага Таварыства. У ходзе месячніка яны накіроўваюць свае намаганні на далейшае ўдасканальванне выхавання працоўных і моладзі на гераічных традыцыях Камуністычнай партыі, савецкага народа і яго Узброеных Сіл, выхаванне іх у духу савецкага патрыятызму, высокай рэвалюцыйнай пільнасці і пастаяннай гатоўнасці да абароны Радзімы.

Пярвічная арганізацыя ДТСААФ, камітэт ЛКСМБ, прафком, спартклуб распрацавалі і зацвердзілі план сумесных мерапрыемстваў у дні месячніка. Ён прадугледжвае правядзенне лекцый, дакладаў і гутарак на тэмы: «У. І. Ленін, КПСС аб абароне сацыялістычнай Айчыны», «КПСС — натхняльнік і арганізатар гераічнай барацьбы савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны», «XXVII з'езду КПСС — наша самаадданая праца», «ДТСААФ — надзейны памочнік і рэзерв Савецкіх Узброеных Сіл» і інш.

Адна з важнейшых задач месячніка — выхоўваць у моладзі глыбокую павагу да бессмяротных подзвігаў прадстаўнікоў старэйшых пакаленняў. З гэтай мэтай на ўсіх факультэтах прадугледжаны сустрэчы студэнтаў з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, былымі партызанамі і падпольшчыкамі, культпаход у Гомельскі краязнаўчы музей і інш. Запланавана таксама падрыхтаваць і правесці традыцыйны Зорны агітпаход студэнтаў па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы Гомельскай вобласці, арганізаваць масавыя спаборніцтвы па стралковаму і іншых ваенна-прыкладных відах спорту, здачу нарматываў па комплексу ГПА.

Ленінскі запавет: «Вучыцца ваеннай справе сапраўдным чынам!» — павінен стаць асноўным стрыжнем, вакол якога будзе будавацца работа ў перыяд месячніка.

У дні месячніка ва ўсіх факультэцкіх арганізацыях ДТСААФ асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на растлумачэнне рашэнняў красавіцкага і кастрычніцкага (1985 г.) Пленумаў ЦК КПСС і перадз'ездаўскіх дакументаў.

Усе гэтыя мерапрыемствы накіраваны на рашэнне галоўнай задачы — актыўнай прапаганды рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцый Камуністычнай партыі і савецкага народа, гераічнай гісторыі Савецкіх Узброеных Сіл і выхаванне студэнцкай моладзі ў духу любві да Радзімы, савецкага патрыятызму і сацыялістычнага інтэрнацыяналізму, на дастойную сустрэчу XXVII з'езда КПСС.

**У. КОЎШ,**
**старшыня камітэта ДТСААФ ГДУ.**

# ЗА МІР НА ЗЯМЛІ

**Заява Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова, новыя мірныя ініцыятывы савецкай дзяржавы выклікалі велізарную цікавасць ва ўсіх калектывах краіны, усяго прагрэсіўнага чалавецтва. Яны шырока і ўсебакова абмяркоўваюцца ў Савецкім Саюзе і за яго межамі, знаходзяць усеагульнае адабрэнне і падтрымку.**

## ЗАМЕСТ УЗБРАЕННЯЎ—ЖЫЦЦЁВЫ ДАСТАТАК

З вялікім хваляваннем чытаў у друку Заяву Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова, іншыя дакументы, накіраваныя на прадухіленне ядзернай катастрофы, паступовае скарачэнне ваенных арсеналаў і іх поўную ліквідацыю. Жыць у міры, не ведаць жахаў вайны, якая можа знішчыць усё чалавецтва, — гэта самая запаветная мара кожнага разумнага чалавека.

Гонка ўзбраенняў, якая дасягнула гіганцкага размаху, патрабуе велізарных матэрыяльных затрат. І гэта ў той час, калі на нашай планеце яшчэ многія сотні тысяч людзей рады кавалку хлеба, штогод ад голаду паміраюць шмат дзяцей. Дык ці не лепш накіроўваць многія мільярды долараў, якія цяпер трацяцца на самыя разбуральныя віды ўзбраенняў, на паляпшэнне дабрабыту людзей, ліквідацыю галечы ў слабаразвітых краінах.

У Заяве М. С. Гарбачова, іншых дакументах савецкай дзяржавы ясна і зразумела выказана пазіцыя КПСС, Савецкага ўрада па мірнае суіснаванне краін з розным сацыяльным ладам. І мы будзем бязмерна рады, калі з цягам часу назаўсёды знікнуць з нашага лексікону такія словы, як «узбраенне», «агрэсія», «вайна».

**А. МАЛАХАЎ,**
**кандыдат геаграфічных навук, дацэнт кафедры галіновых эканомік.**

## РОЗУМ ПЕРАМОЖА

Яшчэ не так даўно я служыў на Ваенна-Марскім Флоце. Савецкая Армія аснашчана першакласнай зброяй. Нашы воіны пільна стаяць на варце Радзімы, гатовы ў любую мінуту даць адпор кожнаму агрэсару, і ніколі першымі не прыменяць зброю. За мяжой, у прыватнасці ў Злучаных Штатах Амерыкі, ёй не перастаюць пагражаць міралюбівым сілам. Таму нам вельмі блізкія і зразумелыя прапановы, выкладзеныя ў Заяве Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова па недапушчэнню ваеннай катастрофы.

Я належу да таго пакалення людзей, якім жыць і працаваць у новым тысячагоддзі. І вельмі хочацца, каб намаганні КПСС і Савецкага ўрада завяршыліся поспехам, на ўсёй зямлі і назаўсёды ўсталяваўся мір.

**Ю. ЛАЎШУК,**
**студэнт гр. БР-51 завочнага факультэта, выкладчык ваеннай падрыхтоўкі Васілевіцкай СШ Рэчыцкага раёна.**

Дзённік сесіі

## ПЕРАМОГІ ДАЮЦЦА НЯЛЁГКА

На зыходзе студзень, самы хвалюючы і напружаны месяц у першым семестры навучальнага года. Завяршаюцца і экзаменацыйныя выпрабаванні студэнтаў. Ім засталося пераадолець апошнія «бар'еры», каб атрымаць запаветныя адзнакі ў залікоўках. Для кагосьці гэтая сесія была першай у студэнцкім жыцці, а для некага апошняй. Але як бы там ні было, зразумела жаданне працавітых і добрасумленных юнакоў і дзяўчат вытрымаць яе паспяхова, не дапусціць прыкрых асечак. Як правіла, усе тыя, хто не ленаваўся рыхтавацца сістэматычна да семінарскіх і практычных заняткаў, не спадзяваўся перад кожным экзаменам на шчаслівы выпадак і паблажлівасць выкладчыкаў, атрымалі выдатныя і добрыя адзнакі.

На жаль, так паступалі не ўсе студэнты. І тое, што пасля аднаго ці нават некалькіх экзаменаў яны выходзілі з экзаменацыйнай аўдыторыі з сумным выглядам пасля атрыманай двойкі, павінна паслужыць ім сур'ёзным урокам на будучае. Па-ранейшаму застаецца хвалюючым пытанне выкарыстання многімі студэнтамі «дапаможнага матэрыялу» — шпаргалак. На якія толькі выдумкі не ідуць тыя «гора-студэнты», якія спадзяюцца толькі на выратавальныя «паперкі». Можна, напэўна, было б наладзіць своеасаблівы конкурс шпаргалак: якіх толькі разнавіднасцей іх не бывае! І што самае прыкрае, убачыць іх можна паўсюдна — у калідорах, на падаконніках, на лесвіцах вучэбных карпусоў. Яны — яскравае сведчанне недобрасумленных і абыякавых адносін студэнтаў да вучобы — свайго галоўнага абавязку. Усё гэта не павінна заставацца па-за ўвагай выкладчыкаў, ім неабходна праяўляць больш прынцыповасці і патрабавальнасці да тых, хто спрабуе атрымаць станоўчую адзнаку любым несумленным шляхам.



Красамоўней усялякіх слоў аб поспехах і няўдачах на экзаменах сведчаць лічбы: агульны працэнт паспяховасці па універсітэту складаў на 18 студзеня 95,4. Пакуль што наперадзе знаходзяцца будучыя біёлагі. У іх працэнт паспяховасці 95,9, за імі ідзе факультэт фізвыхавання — 95,5%. Самыя горшыя вынікі ў геолагаў — усяго толькі 81,8%.



Канчатковыя вынікі зімовай залікова-экзаменацыйнай сесіі будуць падведзены пазней. Іх неабходна дэталёва прааналізаваць на кожным факультэце, у далейшым рабіць усё для павышэння ўзроўню паспяховасці будучых спецыялістаў.

Наш фотакарэспандэнт Н. Кір'янава пабывала на экзаменах на факультэце фізвыхавання і ў будучых геолагаў. На здымку злева вы бачыце дацэнта А. Ф. Семікопа, які прымае экзамен па тэорыі фізвыхавання ў чацвёртакурсніцы, майстра спорту па фехтаванню В. Пятруша. Яе адказ на пытанні білета Арнольд Фёдаравіч ацаніў добрай адзнакай.

У будучых геолагаў ішоў экзамен па інжынернай геалогіі. Яго здавалі дацэнту Л. Д. Мядзведзеву першакурснікі. Каля карты Савецкага Саюза — студэнт групы Г-51 М. Вагнер (на здымку ўверсе). Уважліва слухае яго адказ экзаменатар Л. Д. Мядзведзеў, які паставіў студэнту чацвёрку.

(Наш кар.).

*Ажыццявім планы партыі*

# НА ВЫСОКІЯ ПАТРАБАВАННІ — КАНКРЭТНУЮ СПРАВУ

Гістарычныя рашэнні XXVII з'езда КПСС закранаюць інтарэсы і вызначаюць канкрэтныя напрамкі дзейнасці кожнага калектыву.

Якія ж новыя задачы паўсталі перад намі, геолагамі, у сувязі са стратэгіяй партыі на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны? Скажам прама: іх яшчэ належыць сфармуляваць, абмеркаваць на сходах выкладчыкаў і студэнтаў. Увогуле ж, работы прадстаіць шмат. Перш за ўсё неабходна прыкласці больш намаганняў для якаснага паляпшэння прафесіянальнай падрыхтоўкі і камуністычнага выхавання будучых інжынераў-гідрагеолагаў і геафізікаў, камандзіраў геалагічнай службы. У цэнтры клопатаў павінны стаць аптымізацыя і інтэнсіфікацыя вучэбнага працэсу. Студэнты абавязаны правільна асэнсаваць гэтыя тэрміны. Маецца на ўвазе не патагонная сістэма, не работа над падручнікам да дзвюх гадзін ночы. Нам неабходна распрацаваць цэлую сістэму мерапрыемстваў па паляпшэнню сувязі паміж чытаемымі дысцыплінамі, забеспячэнню факультэта сучаснай вылічальнай тэхнікай, прыборамі і прыстасаваннямі. На першы план цяпер ставіцца камп'ютэрызацыя вучэбнага працэсу. Геамарфалогія, напрыклад, для гідрагеолагаў і інжынераў-геолагаў павінна разглядацца не толькі як навука, якая займаецца вывучэннем рэльефа зямной паверхні, а як пэўныя ўводзіны ў гідрагеалогію і інжынерную геалогію. З другога боку, крэн у напрамку камп'ютэрызацыі не павінен стаць перашкодай для трывалага засваення фундаментальных палажэнняў навук геалагічнага цыкла.

Прафесарска-выкладчыцкі састаў геалагічнага факультэта ў самы бліжэйшы час абавязаны перагледзець адносіны да ўкаранення сваіх навуковых распрацовак у практыку геалагічнай службы хаця б у сістэме вучэбна-навукова-вытворчага аб'яднання «Гомельскі універсітэт — Упраўленне геалогіі БССР». Для гэтага спатрэбяцца двухбаковыя намаганні: і нашы, і геолагаў-практыкаў. Відавочна, давядзецца перагледзець статут гэтага аб'яднання, які павінен абавязаць Упраўленне геалогіі БССР прымаць да выкарыстання распрацоўкі выкладчыкаў геафака, калі яны нават не прадугледжваліся планам.

Па ўсіх напрамках нашай дзейнасці павінны самым сур'ёзным чынам вырашацца праблемы аховы акаляючага асяроддзя. На гэта нас нацэльваюць словы, сказаныя М. С. Гарбачовым: «Да сур'ёзных вывадаў прыводзіць аналіз яшчэ адной групы супярэчнасцей — супярэчнасцей глабальнага маштабу, якія закранаюць самыя асновы існавання цывілізацыі. Размова ідзе перш за ўсё аб забруджванні акаляючага асяроддзя, паветранага басейна і акіянаў, збядненні прыродных рэсурсаў. Праблемы абвастраюцца не толькі залішнімі нагрузкамі на прыродныя сістэмы ў выніку навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, росту маштабаў дзейнасці чалавека. Яшчэ Энгельс прадбачыў, наколькі згубнымі будуць вынікі падпарадкавання прыродакарыстання сляпой гульні рынкавых сіл. Усё больш відавочна акрэсліваецца патрэба ў эфектыўных міжнародных працэдурах і механізмах, якія забяспечвалі б рацыянальнае выкарыстанне рэсурсаў планеты як агульначалавечага здабытку».

XXVII з'езд КПСС надаў новы імпульс дзейнасці ўсяго калектыву нашага факультэта, які па-наватарску павінен сфармуляваць і вырашаць канкрэтныя задачы па забеспячэнню Беларусі мінеральна-сыравіннымі рэсурсамі і іх беражлівому выкарыстанню.

**М. ЖУРАВЕЛЬ,**
**дацэнт кафедры інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі.**

*Гутарка на актуальную тэму*

# У ДЗЕЯННІ — ЛЕНІНСКІЯ

**35 гадоў назад у Савецкім Саюзе быў прыняты Закон аб «Абароне міру».**

Свет без войнаў, свет без зброі — вышэйшая мэта міжнароднай дзейнасці Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы. Ленінскі знешнепалітычны курс адпавядае жыццёвым патрабаванням большай часткі чалавецтва, служыць сацыяльнаму прагрэсу і дабрабыту працоўных. Яго змест вызначаецца прыродай сацыялістычнага ладу жыцця, нашай ідэалогіяй і мараллю.

У нашым сацыялістычным грамадстве няма класаў і сацыяльных груп, зацікаўленых у войнах і гонцы ўзбраенняў. Савецкаму народу патрэбен мір для творчага стварэння, удасканальвання грамадства развітога сацыялізму, пабудовы камунізму.

Палітыка міру ў заканадаўчым парадку замацавана ў Канстытуцыі СССР. Яна знаходзіць адлюстраванне ў важнейшых знешнепалітычных дакументах і акцыях, у паўсядзённай дзейнасці савецкай дыпламатыі. «Наш ідэал, нашы пастаянныя клопаты — усеагульнае і поўнае раззбраенне, трывалы, справядлівы мір» — так напісана ў кнізе «40-годдзе Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне» (М., 1985,). Менавіта гэтай высакароднай і жыццёва важнай мэце служыць прынцыпова новая, сапраўды народная, адкрытая і сумленная знешняя палітыка СССР.

Усё больш пракладвае сабе дарогу ў сусветнай палітыцы прынцып мірнага суіснавання дзяржаў з розным грамадскім ладам — асноўны прынцып міжнародных адносін XX стагоддзя. Сёння савецкая палітыка міру, якая пераўтвараецца ў жыццё, выступае як вядучая сіла ў барацьбе супраць пагрозы ядзернай вайны, за ўмацаванне трывалага міру на зямлі.

Знешнепалітычная дзейнасць КПСС і Савецкай дзяржавы была актыўнай, паслядоўнай і наступальнай на працягу ўсяго перыяду пасля прыняцця Закона аб «Абароне міру».

Адным з важнейшых вынікаў праціборства і спаборніцтва дзвюх сацыяльна-эканамічных сістэм з'яўляецца дасягненне ваенна-стратэгічнай раўнавагі паміж Савецкім Саюзам і арганізацыяй Вар-

*У камітэце ЛКСМБ*

# ДА ВУЧОБЫ АДНОСІЦЦА СУР'ЁЗНА

**На чарговым пасяджэнні камітэта ЛКСМБ універсітэта абмеркавана пытанне аб рабоце камітэта камсамола гісторыка-філалагічнага і камсамольскага бюро фізічнага факультэтаў па стварэнню непрымірымых адносін да студэнтаў, якія несумленна адносяцца да свайго галоўнага абавязку — вучобы, парушаюць дысцыпліну. Са справаздачамі выступілі камсамольскія важакі названых факультэтаў Юрый Пеняз і Віктар Пракапенка.**

**Адзначаны істотныя недахопы ў дзейнасці вучэбна-выхаваўчых камісій абодвух факультэтаў па забеспячэнню актыўнага наведвання студэнтамі вучэбных заняткаў і ўзорнай дысцыпліны. Для дасягнення гэтага распрацаваны адпаведныя мерапрыемствы.**

МАТЭМАТЫКІ — ШКОЛЕ

# СУСТРЭЛІСЯ СА СТАРШАКЛАСНІКАМІ

Сапраўднае жыццё ў школе пачынаецца ў той час, калі там з'яўляюцца студэнты. Магчыма, так сказаў бы і вядомы Казьма Пруткоў, калі б 3-га сакавіка наведаў СШ № 7 нашага горада. Гэта быў панядзелак. Як вядома, гэта — цяжкі дзень. Менавіта ў панядзелак жаданым госцем старшакласнікаў стаў клуб аматараў гумару нашага факультэта на чале з выкладчыкам кафедры алгебры і геаметрыі членам партбюро матфака А. Ф. Васільевым.

У сваім выступленні ён расказаў пра матэматычны факультэт, пра навуковае, грамадскае і культурнае жыццё студэнтаў-матэматыкаў. Пасля гэтага ўвагай старшакласнікаў, якія да адказу запоўнілі актавую залу школы, завалодалі студэнты. На невялікай школьнай сцэне 13 будучых педагогаў і праграмістаў на працягу гадзіны ў жартаўліва-сатырычнай форме апавядалі пра сваё студэнцкае жыццё. Жартоўныя песні, гумарыстычныя маналогі, сатырычныя, а часам і вострасатырычныя інтэрмедыі і пароды — усё гэта знаходзіла гарачую падтрымку школьнікаў, якія не засталіся ў накладзе: нямала здзівілі студэнтаў, паказаўшы інтэрмедыю «Пары», у якой размова вялася пра тэорыю імавернасці.

Сустрэча са школьнікамі надоўга застанецца ў памяці кожнага старшакласніка і нас, студэнтаў.

«Прыходзьце яшчэ! — запрашалі нас вучні. — Мы будзем вас чакаць».

**А. НЕСЦЕРАЎ,**
**студэнт гр. М-54.**

# З'ЯДНАНЫ БРАТНЯЮ ДРУЖБАЙ

**Сёлета спаўняецца 20 гадоў з дня ўстанаўлення дружалюбных сувязей паміж Гомельскай і Паўднёвачэшскай абласцямі.**

Шырокая геаграфія міжнародных сувязей у нашай вобласці. Дастаткова сказаць: толькі ў Гомелі, напрыклад, вучацца студэнты больш чым з 20 краін свету. Але самыя інтэнсіўныя кантакты звязваюць Гомель з пабрацімамі — Паўднёвачэшскай вобласцю ЧССР і французскім горадам Клярмон-Феран, а таксама з Еленегурскім ваяводствам ПНР.

У 1966 годзе ЦК КПСС і ЦК КПЧ прынялі гістарычнае рашэнне — парадніць паміж сабой рад гарадоў і абласцей Расіі, Беларусі і Украіны з гарадамі Чэхіі і Славакіі. Гэта рашэнне адпавядала не толькі духу ўмацавання супрацоўніцтва дзвюх краін і палітыцы, якую праводзіла Сусветнае аб'яднанне параднёных гарадоў, але і пастаяннаму імкненню братніх народаў да больш глыбокага ўзаемаразумення. Пабрацімамі сталі сталіцы дзвюх дзяржаў — Масква і Прага, а Гомельская вобласць устанавіла сяброўскія сувязі з блізкай ёй па эканоміцы і культуры Паўднёвачэшскай вобласцю.

За два дзесяцігоддзі ўмацавалася супрацоўніцтва паміж Гомелем і цэнтрам Паўднёвай Чэхіі — г. Чэске — Будзеёвіцэ, яшчэ 9 гарадоў Гомельшчыны ўстанавілі братнія кантакты з чэшскімі гарадамі: Добруш — Чэске-Крумлаў, Жлобін — Пельгржымаў, Калінкавічы і Петрыкаў — Індржыхаў — Градзец, Мазыр — Страконіцэ, Рэчыца — Пісэк, Рагачоў — Прахатыцэ, Светлагорск — Табар.

Асабліва ўмацавалася дружба дзвюх абласцей за апошнія 5 гадоў. Прывядзем унушальныя лічбы: цяпер 42 прадпрыемствы Гомельшчыны маюць прамыя кантакты з роднаснымі чэшскімі калектывамі. Толькі за гэтыя гады нашу вобласць наведалі 184 чэхаславацкія дэлегацыі, 200 груп гамяльчан ездзілі ў Чэхаславакію. Штогод у 11 піянерскіх лагерах вобласці адпачывае каля 500 дзяцей з ЧССР, а 240 юных гамяльчан праводзяць канікулы ў Чэхіі.

Можа ўзнікнуць пытанне: а ці ёсць эканамічная выгада ад гэтых кантактаў? Тут таксама не абысціся без пераканаўчых фактаў. Напрыклад, першы айчынны самаходны кормаўборачны камбайн КСК — 100 сабраны на «Гомсельмашы» дзякуючы ў многім імпарту камплектуючых дэталей з краін сацыялістычнага супрацоўніцтва, у тым ліку Чэхаславакіі, якая забяспечыла пастаўку аўтаматызаваных ковачных прэсаў і гідратрансмісій. Абмен навукова-тэхнічнай інфармацыяй з нацыянальнымі прадпрыемствамі «Аграбуд» дазволіў камбайнабудаўнікам выпускаць дэталі, якія маюць у чатыры разы большую трываласць за раней выпускаемыя. Кожны чэхаславацкі гідракамплект, устаноўлены на камбайне, прыносіць эканамічны эфект у 550 рублёў. Праектуемая сумесна сістэма аўтаматычнага ваджэння дасць прыбытак у 660 руб. ад кожнага камбайна.

Чэхаславацкі вопыт, які ўкаранёны ў вытворчым аб'яднанні «Белэмальпасуда», супрацоўнічаючым з фірмай «Сфінкс», даў эфект за год у 180 тыс. руб. і дазволіў з'эканоміць 2 млн. квт. гадзін электраэнергіі.

У сваю чаргу значны ўклад у супрацоўніцтва ўносяць гамяльчане, асабліва ў экспартных пастаўках прадукцыі ў ЧССР. У прыватнасці, на «Гомсельмашы» нават адкрыта пастаяннае прадстаўніцтва чэхаславацкай знешнегандлёвай фірмы «Марцімэкс».

Нішто не можа замяніць блізкае знаёмства з дасягненнямі і культурай сяброў, што стала магчымым у выніку развіцця шырокага турысцкага абмену.

У 1977 годзе наш універсітэт заключыў дагавор аб дружбе з Вышэйшай сельскагаспадарчай школай у горадзе Чэске-Будзеёвіцэ. З таго часу кожнае лета адзін з лепшых атрадаў ГДУ выязджае для работы ў Чэхаславакію, а паўднёвачэшскія студэнты прыязджаюць працаваць на Гомельшчыну.

Значнасць і высокі ўзровень сяброўскіх сувязей дзвюх абласцей пацвердзіў візіт, які ў 1985 г. нанёс у Гомель Надзвычайны і Паўнамоцны пасол у Савецкім Саюзе Міраслаў Завадзіл. Па даручэнню свайго ўрада ён высока ацаніў вынікі супрацоўніцтва пабрацімаў.

Цяжка знайсці ў Паўднёвай Чэхіі чалавека, які б не ведаў пра нашу вобласць. А слова «Гомель» у вуснах савецкіх грамадзян, якія прыбываюць у Паўднёвачэшскі край, стала ключом для дружалюбства і ўзаемаразумення. Не выпадкова іменем нашага горада ў Чэске-Будзеёвіцэ названа 16-павярховая гасцініца, пабудаваная ў 1982 годзе.

У гэтым годзе люты для савецкага і чэхаславацкага народаў стаў асаблівым месяцам. У Чэхаславакіі па традыцыі адзначана гадавіна гістарычнай перамогі над рэакцыяй у 1948 г., стаўшай рэвалюцыйным паваротам да сацыялізму. Прагучаўшы тады заклік першага народнага прэзідэнта Клемента Готвальда «З Савецкім Саюзам — на вечныя часы!» стаў залогам дружбы дзвюх краін. Для савецкіх людзей люты — месяц XXVII з'езда КПСС, які разам з іншымі важнымі гістарычнымі дакументамі прыняў Асноўныя напрамкі эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986-1990 гады і на перыяд да 2000 года. У іх ёсць і такія радкі: «Шырэй разгвортваць кааперацыю з краінамі — членамі СЭУ...Актыўней уключаць у гэту работу аб'яднанні і прадпрыемствы, у тым ліку шляхам развіцця прамых вытворчых сувязей з прадпрыемствамі братніх краін, а таксама стварэння сумесных прадпрыемстваў».

Гэта значыць, што для дружбы і супрацоўніцтва нашых краін, Гомельскай і Паўднёвачэшскай абласцей адкрываюцца новыя перспектывы.

**Т. МАСЛЮКОЎ,**
студэнт гр. Г-51 гісторыка-філалагічнага факультэта.



У ЧССР захавалася нямала помнікаў шматвяковай дружбы з нашай краінай.

НА ЗДЫМКУ: у гэтым доме, ў г. Карлавы Вары, калісьці жыў Пётр I.

Фота аўтара.

# КНІГІ КУПЛЯЕ МАГАЗІН

**Букіністычны гандаль садзейнічае найбольш поўнаму задавальненню попыту пакупнікоў на літаратуру. З яго дапамогай кнігу можна выкарыстоўваць неаднаразова. Менавіта букіністычны гандаль вяртае да жыцця многія каштоўныя і карысныя выданні, якія часам з'яўляюцца «бібліяграфічнай рэдкасцю».**

Яшчэ зусім нядаўна купля букіністычнай літаратуры ў рэспубліцы праводзілася з выплатай уладальніку няпоўнага кошту. Такім чынам, страты нёс уладальнік кніг, а пакупнік набываў выданні за меншы кошт.

Для таго, каб зацікавіць аматараў кнігі ў здачы букіністычнай літаратуры, павялічыць прыток кніг, перш за ўсё навукова-папулярных, дзіцячых, на замежнай мове, мастацкай літаратуры 1977—1979 гадоў выпуску, быў задуманы эксперымент па куплі букіністычных выданняў павышанага попыту з выплатай уладальніку поўнага кошту, гэта значыць, па выдавецкаму наміналу. Уладальнікі бібліятэк аднадушна адобрылі такое пачынанне. Эксперымент даў ім магчымасць без усялякіх страт, матэрыяльных і маральных, здаць прачытаную літаратуру ў кнігарні, атрымаўшы камісійнае ўзнагароджанне.

З ліпеня 1983 года купля кніг з выплатай іх поўнага кошту дзейнічае ўжо не як эксперымент, а як новая прагрэсіўная форма букіністычнага гандлю.

Гэтая новая форма паслуг распаўсюджваецца на навукова-папулярную, дзіцячую і мастацкую літаратуру, а таксама выданні на замежных мовах, якія выйшлі з 1961 па 1984 гады ўключна і карыстаюцца павышаным попытам у насельніцтва. Іх купляе і наша кнігарня № 19 (вул. Савецкая, 106) за поўны кошт. Пасля таго, як магазін набыў кнігі за поўны кошт, ён устанаўлівае на іх новы прадажны кошт, які на 20% вышэй іх выдавецкага наміналу. Камісійнае ўзнагароджанне (розніцу паміж прадажным і пакупным коштамі) пры гэтым аплочвае пакупнік. Кнігарні купляюць таксама літаратуру, якая выдадзена з 1961 па 1976 гады ўключна і карыстаецца попытам у насельніцтва. На яе ўстанаўліваецца кошт па двайному наміналу.

Магазіну дадзена права не купляць літаратуру:

— якая страціла сваю навуковую, гістарычную або мастацкую каштоўнасць;

— з запісамі на палях старонак, з падкрэсленым тэкстам, без тытульнага ліста;

— якія маюць штампы або пячаткі ўстаноў, грамадскіх арганізацый і бібліятэк, выпушчаную для службовых мэт;

— якая не мае цаны і па свайму знешняму выгляду прыйшла ў нягоднасць (брудны пераплёт, пашкоджаныя старонкі, з друкарскім бракам, з якімі-небудзь абмяжоўваючымі ўказаннямі: «кантрольны экземпляр», «сігнальны экземпляр», «на правах рукапісу» і г. д.

**Н. ШАТОН,**
**прадавец кнігарні № 19.**

*Глядзіце новы фільм*

# ПЕРАСЦЯРОГА ПАМЯЦІ

**На кінаэкраны выходзіць новы мастацкі фільм «Ідзі і глядзі», які на XIV Маскоўскім міжнародным кінафестывалі атрымаў Залаты прыз. Ён пастаўлены на кінастудыях «Беларусьфільм» і «Масфільм» пісьменнікам Алесем Адамовічам і рэжысёрам Элемам Клімавым.**

**У фільме ўзнята важная і актуальная тэма. Ён раскрывае глыбока антычалавечую сутнасць фашызму на прыкладзе яго страшэнных злачынстваў на беларускай зямлі ў гады другой сусветнай вайны.**

Здаецца, просты сюжэт фільма. Пайшоў у партызаны хлопчык Флёра (за гэта немцы пакаралі яго маці і дзвюх сястрычак), сустрэў у атрадзе дзяўчыну Глашу і разам выбіраюцца яны з лесу, які прачэсваюць фашысты. Потым яны аказваюцца на астраўку сярод топкай багны, дзе знайшлі паратунак ад рук фашыстаў аднавяскоўцы Флёры. Аднак гэта толькі пачатак трагедыі. Флёру давядзецца стаць сведкай жудаснага відовішча. Жанчын, дзяцей, старых, усіх жыхароў вёскі Пераходы, фашысты зганяюць у клець. Аблітая бензінам, запалае яна на яго вачах, і людзі прымуць пакутлівую смерць. Эсэсаўцы ж будуць фатаграфавацца «на памяць» на фоне гэтага пекла, прыстаўляючы дула рэвальвера да скроні Флёры — «палоннага партызана»...

У фільме створан небывалы сплаў нечалавечых пакут і чалавечнасці, нянавісці і любві. Таму што пранесена ўсё гэта праз пранізліва, з ашаламляльнай навязной убачаны і раскрыты характар юнага героя (яго ролю выканаў школьнік, цяпер навучэнец ПТВ Алеша Краўчанка), народны вобраз, увасабляючы ўзрушаную памяць тысяч і тысяч хлапчукоў «вогненныя вёсак», Сталінграда.

А. Адамовіч, Э. Клімаў, аператар А. Радзіёнаў паказваюць усю бесчалавечнасць вайны і ўсю нашу нянавісць да яе. «Пераканаsuccessfully:" тыя, хто не ведаў жорсткасці і жахаў фашызму, не маюць права ўхіляцца ад цяжару гэтых ведаў. Таму што, даведаўшыся, што такое магчыма на свеце, нельга заставацца ў баку ад барацьбы з ваеннай пагрозай» — вось пазіцыя аўтараў фільма, выказаная А. Адамовічам.

Усе, хто будзе глядзець гэты фільм, прасякнуцца нянавісцю. Калі на нашых вачах адбываецца народная трагедыя спальвання вёскі, жах якой узмацняе зверства гітлераўцаў, здаецца, што няма на свеце пачуцця мацней за нянавісць. Галоўней помсты. Сівы хлапчук Флёра (цяпер зусім іншы чалавек, у вачах якога назаўсёды застыў жах перажытага) знаходзіць сваю вінтоўку і павольна перавязвае бінтом разбіты прыклад. З партызанскага лесу выходзяць народныя мсціўцы. Знішчаны, сцёрты з твару зямлі атрад карнікаў, расстраляны афіцэры-эсэсаўцы, у бруднай лужыне валяецца партрэт Гітлера... Флёра ўскідвае вінтоўку і страляе ў партрэт, яшчэ, яшчэ і яшчэ раз!.. Па экрану праносіцца мантаж гітлераўскай кінахронікі: палаюць гарады, крочаць полчышчы захопнікаў, шалее перад мікрафонам Гітлер, і выстралы Флёры кожны раз даганяюць, паражаюць кадр-мішэнь, адкідваюць, адкручваюць назад прывіды гітлераўскага нашэсця. Рэха гэтых выстралаў, нібы гром, раздаецца ў нашым сённяшнім дні. Глядзі і памятай! Гэта не павінна паўтарыцца!

**Мастацкі фільм «Ідзі і глядзі» будзе дэманстравацца ў кінатэатры «Спартак» 14—16 лютага. Пачатак сеансаў: 10, 14-30, 17, 20-30.**




*Спорт*

# НА ЗАСНЕЖАНЫМ ПОЛІ

На працягу амаль месяца праходзіў турнір на прыз Цэнтральнага стадыёна «Гомсельмаш». У ім прынялі ўдзел каманды Гомельскага дзяржуніверсітэта, фабрыкі «Спартак», таварыства глухіх і гомельскай СДЮСШАР. Гульні праходзілі па кругавой сістэме. Дзве каманды, якія набралі больш ачкоў, павінны былі разыграць першае і другое месцы. Імі аказаліся футбалісты ГДУ і «Спартака», якія набралі па чатыры ачкі.

Нядаўна адбыўся фінальны матч для выяўлення ўладальніка прыза. З лікам 3:1 перамаглі студэнты.

Пасля матча дырэктар стадыёна А. М. Макарэвіч уручыў камандзе-пераможцы пераходны прыз.

**М. ВЫСОЦКІ,**
**суддзя рэспубліканскай катэгорыі.**

# ЗАПРАШАЕ СЯМЕЙНЫ СПАРТЫЎНЫ КЛУБ

2-га лютага ў спартзале універсітэта адбудзецца спартыўнае свята ўдзельнікаў сямейнага клуба. У час яго будуць праводзіцца захапляючыя эстафеты, рухомыя гульні, спаборніцтвы паміж сем'ямі і г. д.

Пераможцаў чакаюць памятныя прызы.

Тыя, хто яшчэ не стаў пастаянным членам сямейнага спартыўнага клуба ГДУ, спяшайцеся! Прыходзьце да нас разам са сваімі дзецьмі любога ўзросту кожную нядзелю ў 14 гадзін на заняткі спартклуба. Тут вас чакае зарад бадзёрасці, здароўя, выдатны настрой.

**Г. ЧАРНЫХ,**
**старшыя сямейнага спартклуба.**

**ІНФАРМАЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ ЛАБАРАТОРЫІ ТСН ПАВЕДАМЛЯЕ**

# КІНО Ў ДАПАМОГУ ВЫКЛАДЧЫКУ

У Гомельскую абласную кантору кінапракату паступілі новыя вучэбныя і навукова-папулярныя кінафільмы:

**«У межах магчымага»**, 2 часткі, 16 мм (Аб межах чалавечых магчымасцей).

**«Інфармацыя да роздуму»**, 2 ч., 16 мм. (Аб біялагічных сістэмах).

**«Майстэрня Флоры»**, 5 ч., 35 мм. (Аб жыцці ўсяго жывога).

**«Шосты нябачны акіян»**, 2 ч., 16 мм. (Аб магнітным полі Зямлі і яго ўплыве на біялагічныя аб'екты).

Усе гэтыя кінафільмы можна заказаць праз лабараторыю ТСН універсітэта (1-ы корпус, п. 1—10).

*Парады ўрача*

# НЕ ТАКІ БЯСШКОДНЫ, ЯК ЗДАЕЦЦА

**Грып — інфекцыйнае захворванне, эпідэміі якога найбольш часта ўзнікаюць восенню і зімой. Узбуджальнікам яго з'яўляецца вірус, які трапляе ў арганізм чалавека пры ўдыханні паветра. Крыніцай хваробы з'яўляецца хворы чалавек, які ў час кашлю і чхання выдзяляе з кроплямі сліны і вірусы грыпу. У сувязі з гэтым найбольшую небяспеку ўяўляюць людзі, якія, адчуўшы недамаганне, працягваюць хадзіць на работу, вучобу, з'яўляюцца ў грамадскіх месцах, рассейваючы такім чынам інфекцыю.** На жаль, сярод людзей існуе думка, што грып — хвароба дробязная, што яе можна перанесці на нагах. Шкода ад такіх адносін — відавочная. І сам грып і яго ўскладненні (ангіны, запаленне лёгкіх, сярэдняга вуха, захворванне прыдаткавых пазух носа) могуць істотна падарваць здароўе. Пад уплывам грыпу нярэдка абвастраюцца хранічныя хваробы сэрца і суставаў, туберкулёз, рэўматызм і інш.

З'яўленне насмарку, кашлю, лёгкіх дрыжыкаў павінна ўспрымацца як востры сігнал аб небяспецы не толькі для гэтага чалавека, але і для акаляючых.

Ранні зварот да ўрача забяспечвае хутчэйшае выздараўленне і не прыносіць ускладненняў хваробы.

Лячэнне пачынаецца з ложкавага рэжыму і ізаляцыі хворага (асобны пакой, шырма). Ежа павінна быць паўнацэннай, з вялікім утрыманнем вітамінаў, вадкасці. Добра дапамагае ў такіх выпадках моцны гарачы чай з мёдам або сухой малінай. Наяўнасць у часнаку і цыбулі фітанцыдаў згубна ўздзейнічае на мікробы. Ужыванне часнаку і цыбулі — добры метад для прафілактыкі інфекцыйных захворванняў.

У першыя дні хваробы добры лячэбны эфект аказвае супрацьгрыпозны прэпарат рэмантадзін. Ён выкарыстоўваецца таксама і ў мэтах прафілактыкі грыпу (па 1 таблетцы 1 раз у дзень). Ёсць таксама і іншыя супрацьгрыпозныя сывараткі і вакцыны, вітаміны, з дапамогай якіх можна пазбегнуць захворвання грыпам: аксалінавая мазь (наносіцца на слізістую абалонку носа), лейкацытарны інтэрферон (распыляецца або закапваецца ў нос 3 разы ў дзень па 3—4 кроплі, а таксама вітамін «С», (яго прымяняюць па 0,5 г 10—12 дзён).

Асноўным сродкам папярэджвання захворвання грыпам з'яўляецца захаванне правіл асабістай гігіены, частае праветрыванне памяшкання, яго вільготная ўборка, стараннае мыццё твару і рук з мылам пасля догляду за хворым, пасля вяртання з работы, вучобы, язды ў грамадскім транспарце і г. д., загартоўванне арганізма.

Захоўваючы ўсе пералічаныя прафілактычныя мерапрыемствы па папярэджанню грыпу, вы збераджэце сваё здароўе і акаляючых вас людзей.

**Г. РАСІНА,**
**урач-атарынголаг паліклінікі № 6,**
**член Таварыства Чырвонага Крыжа.**

*Вясёлы перапынак*

# УСМЕШКІ НА СЕСІІ

● ГАМЛЕТ — студэнт перад дзвярыма аўдыторыі, дзе праходзіць экзамен.

● ПЕРАЭКЗАМЕНОЎКА — «Блуканне па пакутах».

● ТУМАННАСЦЬ АНДРАМЕДЫ — стан мозгу студэнта ў пачатку экзаменацыйнай сесіі.

● РУБІКОН — парог экзаменацыйнай аўдыторыі.

● ДЭВАЛЬВАЦЫЯ — абясцэньванне прымаўкі «Маўчанне — золата».

● БЛУДНЫ СЫН — студэнт, які прыйшоў на экзамен пасля шматлікіх пропускаў.

● ПАТЫЛІЦА — цэнтр узбуджэння памяці.

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

АЗ 13013

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.

Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 57-16-52.

Заказ 70.